# БУДУЕЦЦА НОВЫ МЕНСК

**Клінічны гарадок** — будаўніцтва ідзе ўзмоцненым тэмпам. У асноўным скончаца пабудова ўсіх 4 карпусоў—генэкалёгічнага, хірургічнага, вэнэралёгічнага і тэрапэўтычнага. Работа скончана на месяц раней вызначанага тэрміну. Увесь гарадок павінен быць зданы ў кастрычніку 1930 году. Кошт будаўніцтва 1.600.000 руб.

**Палітэхнікум**—канчаецца кладка 3-га паверху інтэрнату. Прыступлена да будаўніцтва фундаманту галоўнага корпусу і майстэрні палітэхнікуму. Сёлета работы ўчарне будуць скончаны. Кошт будаўніцтва — 1.200.000 руб.

**Беларуская Акадэмія Навук** — распрацоўваюцца рабочыя чарцяжы. Прыступлена да разьбіўкі тэрыторыі аднаго з карпусоў. У гэтым годзе будзе закладзены фундамант усяго будынку і скончана кладка аднаго з карпусоў Агульны кошт будаўніцтва — 2 млн. руб.

**Дзяржбіблiятэка** — работы разгортваюцца невыстарчальным тэмпам з прычыны недахопу таўравых балек і труб для паравога ацяпленьня. Будаўнічая праграма выканана на 45-50 проц. Да сучаснага моманту няма праектаў цёплафікацыі.

**76 кватэрны дом па Маскоўскай вуліцы** — усе асноўныя работы скончаны. Зараз ідзе апрацоўка будынку. Дом будзе гатовы да 1 верасьня—на месяц раней тэрміну.

**Аўтаматычная тэлефонная станцыя** — прыступлена да кладкі другога паверху. Будаўніцтва затрымліваецца з прычыны недахопу матар'ялаў і адсутнасьці чарцяжоў. Дасюль будаўнічае бюро Наркампаштэлю не падало чарцяжоў будынку. Будаўніцтва станцыі павінна быць скончана да 1 кастрычніка 1930 году. Кошт будаўніцтва — 245 тысяч руб.

**Мэханічная пральня** — прыступлена да пабудовы трох мэханічных пральняў: пры першай больніцы, камтрэсьце і яськях. Пральні, паводле пляну, павінны быць гатовы да 1 студзеня 1931 году.

**Цагельні** — маюць вялікі прарыў у выкананьні пляну загатоўкі сырцу. Плян выкананы ўсяго на 50 проц. Выклікана гэта адсутнасьцю рабсілы. Не хапае каля 200 рабочых. Менбуд мабілізаваў рабочых усіх пабудоў на ліквідацыю прарыву ў рабоце цагельняў. Кожны дзень рабочыя якой-небудзь пабудовы працуюць на заводах. Гэта мера дасьць магчымасьць загатовіць 3-4 млн. штук сырцу і часткова ліквідаваць прарыў. Прадстаўнікі Менбуду камандыраваны ў Смаленскі раён і вёскі БССР для вярбоўкі рабочых. Адначасова Менбуд прыступіў да пабудовы двух новых цагельняў, якія будуць поўнасьцю мэханізаваны. Пуск новых заводаў прызначаны на 20 ліпеня.

**Дом Ураду** — ідзе кладка першага паверху ўсяго корпусу. Канчаецца закладка фундаманту залі пасяджэньняў. Тэрміны каляндарнага пляну ня выкананы. Разгортваньне работ затрымліваецца з прычыны нястачы некаторых матар'ялаў, галоўным чынам, жалезных балек. На буданіцтве занята каля 500 чалавек. У гэтым годзе Дом Ураду павінен быць скончаны ўчарне.